16. Ліндер, Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. / пер. з ням. Л. Баршчэўскага; нав.рэд. Г. Сагановіча. Выд. 2. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2005. – 540 с.
17. Лінднэр, Р. Беларускія гісторыкі пад Сталіным (1870–1945) / Р. Ліндэр. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.belhistory.eu/rajner-lindner-belaruskiya-gistoryki-pad-stalinym-1870%E2%80%931945/. – Дата доступа: 21.04.2018.
18. Мяснікоў, А.Ф. Нацдемы: Лес і трагедыя Ф. Шантыра, У. Ігнатоўскага і Я. Лесіка. – Мінск: Беларусь, 1993. – 110 с.
19. Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX стагоддзі: Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 27–28 лютага 1998 г.) / Склад. і навук. рэд.: Н.І. Стужынская. – Мінск, 1998. – 278 с.
20. Петаченко, Г.А. Пролетаризация советской школы (1918–1929 гг.): автореф. дисс. … канд. ист. наук: 07.00.03 / Г.А. Петаченко. – Минск, 2013. – 24 с.
21. Платонаў, Р.П. Беларусізацыя 1920-х гадоў: асаблівасці і праблемы ажыццяўлення // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 1. / Рэд. кал.: Р.П. Платонаў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелНДІДАС, 2000 – 266 с.
22. Платонаў, Р.П. Палітыкі. Ідэі. Лёсы: Грамадзянскія пазіцыі ва ўмовах нарастання ідэолагапалітычнага дыктату ў Беларусі 20–30-х гг. – Мінск.: БелНДІДАС, 1996 г. – 383 с.
23. Протько, Т.С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917–1941) / Т. С. Протько. – Минск.: Тесей, 2002. – 686 с.
24. Репрессивная политика советской власти в Беларуси: сб. науч. работ / Сост. И. Кузнецов, Я. Басин. – Вып. 1. – Минск, 2007. – 376 с.; – Вып. 2. Минск, 2007. – 377 с.; – Вып. 3. – Минск, 2007. – 373 с.
25. Хлевнюк, Д. Бернард Гизен. Триумф и травма / Д. Хлевнюк // Социологическое обозрение. – 2010. – Т. 9. – № 2. – С. 112–117.
26. Штомпка, П. Социальное изменение как травма (статья первая) / П. Штомпка // Социологические исследования. – 2001. – № 1. – С. 6–16.
27. Яноўскі, А.А. І прафесар, і кіраўнік: некаторыя радкі з біяграфіі М.М. Нікольскага / А.А. Яноўскі // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. – Вып. 3. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 166–174.

**Маслоўскі Яўген Валер'евіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ДЫНАМІКА КОЛЬКАСЦІ І СКЛАДУ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІХ РАБОЧЫХ У БЕЛАРУСІ Ў 1907–1914 гг.

Пошук крыніц дзяржаваўтваральных працэсаў у Беларусі ў 1914–1921 гг. павінен абапірацца на аналіз становішча прамысловага пралетарыяту беларускіх губерняў (Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай) у пачатку XX ст. Менавіта гэта частка беларускага грамадства з'яўлялася адным з каталізатарам карэнных зменаў у беларускім грамадстве. Вывучэнне полаўзроставага складу рабочых дазваляе вызначыць воблік тагачаснага прамысловага пралетарыя Беларусі.

У 1907–1914 гг. працягваўся працэс фарміравання прамысловага пралетарыяту Беларусі, які быў непарыўна звязаны з развіццём капіталізму ў прамысловасці. Развіццё капіталізму паскорылася пасля сялянскай рэформы 1861 г., згодна з якой сяляне атрымалі права самастойна распараджацца сваёй рабочай сілай, і найм стаў асноўнай формай адносінаў.

Пралетарыят фарміраваўся з сялян, рамеснікаў, уладальнікаў дробных прадпрыемстваў і дробных гандляроў, якія не вытрымлівалі канкурэнцыі з буйнымі прамысловымі ўстановамі, разараліся і папаўнялі рады пралетарыяту [3, с. 37–40].

З развіццём фабрычнай вытворчасці значная частка сялян, якія раней займаліся саматужнай вытворчасцю, разараліся. Менавіта яны

пераўтвараліся ў наёмных рабочых. [3, с. 41].

Важную ролю ў сацыяльнай дыферэнцыяцыі сялянства адыгрывалі неземляробчыя промыслы. Неземляробчы адыход адрозніваўся большай працягласцю, адрывам ад сельскагаспадарчай вытворчасці, больш глыбокім разрывам з вёскай. У выніку рэгулярных і доўгатэрміновых адлучак у гарады на фабрыкі і заводы сяляне страчвалі сувязь з гаспадарчым жыццём вёскі, пераўтвараліся ў пастаянных прамысловых рабочых. Паступова слабела сувязь з зямлёй і тых сялян, якія працавалі на мясцовых фабрыках і заводах.

Гэта была завяршаючая стадыя дыферэнцыяцыі сялянства, адрыву ад сродкаў вытворчасці, пераўтварэнне іх у прамысловых рабочых [4, с. 42]. Папаўненне радоў пралетарыяту адбывалася таксама за кошт разарэння дробных майстэрняў. У выніку канкурэнцыі гаспадары дробных майстэрняў пападалі ў залежнасць ад больш заможных рамеснікаў ці фабрык, або пераўтвараліся ў наёмных рабочых. З разарэннем майстэрняў рабочыя вымушаны былі шукаць сабе новае месца працы. У перыяд крызісаў рамеснікі разараліся хутчэй. Не маючы абаротнага капіталу на пакупку сыравіны і будучы не ў стане чакаць пакупніка, рамеснікі вымушаны былі працаваць на больш моцнага прадпрымальніка. Такім чынам, рамеснікі пераўтвараліся ў наёмных рабочых [1, с. 74].

Пад «прамысловымі рабочымі» разумеецца буйны атрад працоўнага класа Беларусі – рабочых фабрычна-завадской прамысловасці, якія працавалі на прадпрыемствах падначаленых кантролю фабрычнай інспекцыі [9, с. 11]. У 1907–1914 гг. колькасць рабочых мела тэндэнцыю да пастаяннага павелічэння. Пра гэта сведчаць статыстычныя дадзеныя, сабраныя і апрацаваныя фабрычнай інспекцыяй і некаторымі даследчыкамі.

**Табліца 1. Колькасць рабочых у беларускіх губернях у 1907–1914 гг.***

| Гады | Губерні | Устаноў | Малалетніх | Падлеткаў | Дарослых | Муж. | Жан. | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1907 | Віцебская | 82 | 346 | 880 | 5005 | 4022 | 2209 | 6231 |
| | Віленская | 255 | 242 | 1136 | 7771 | 7068 | 2171 | 9231 |
| | Гродзенская | 414 | 119 | 1141 | 12640 | 8502 | 5398 | 13900 |
| | Мінская | 218 | 196 | 1124 | 7385 | 6067 | 2539 | 8606 |
| | Магілёўская | 87 | 169 | 810 | 5244 | 4597 | 1626 | 6223 |
| 1910 | Віцебская | 89 | 297 | 939 | 5458 | 4363 | 2331 | 6694 |
| | Віленская | 219 | 344 | 1203 | 8589 | 7408 | 2728 | 10136 |
| | Гродзенская | 451 | 111 | 1143 | 13514 | 9312 | 5456 | 14768 |
| | Мінская | 255 | 353 | 1437 | 8150 | 6960 | 2980 | 9940 |
| | Магілёўская | 97 | 188 | 778 | 6198 | 5118 | 2051 | 7169 |
| 1912 | Віцебская | 96 | 479 | 1126 | 5888 | 5004 | 2489 | 7493 |
| | Віленская | 237 | 568 | 1354 | 10011 | 8658 | 3275 | 11933 |
| | Гродзенская | 533 | 192 | 1560 | 14794 | 10433 | 6113 | 16546 |
| | Мінская | 286 | 419 | 1825 | 9108 | 7999 | 3253 | 11252 |

* Заўвага: табліцы 1–5 складзены на аснове крыніц : 8, с. 38–39; 9, с. 38–41; 10, с. 26–28; 11, с. 26–29.

| Гады | Губерні | Устаноў | Малалетніх | Падлеткаў | Дарослых | Муж. | Жан. | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Магілёўская | 125 | 150 | 842 | 7044 | 5943 | 2093 | 8036 |
| 1913 | Віцебская | 106 | 598 | 1055 | 6787 | 5749 | 2691 | 8440 |
| | Віленская | 225 | 425 | 1466 | 10400 | 8767 | 3524 | 12291 |
| | Гродзенская | 569 | 196 | 1392 | 16286 | 11227 | 6647 | 17874 |
| | Мінская | 282 | 420 | 2319 | 10409 | 9138 | 3710 | 12848 |
| | Магілёўская | 124 | 104 | 841 | 7361 | 6043 | 2264 | 8307 |

Пры разглядзе даных, якія прыведзены ў табліцы 1 варта звярнуць ўвагу на адносна невялікую долю малалетніх.

**Табліца 2. Удзельная вага малалетніх (12–15 гадоў) сярод агульнай колькасці рабочых у працэнтах**

| Губерня | 1907 г. | | 1910 г. | | 1912 г. | | 1913 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Муж. | Жан. | Муж. | Жан. | Муж. | Жан. | Муж. | Жан. |
| Віцебская | 2,82 | 2,73 | 2,18 | 2,26 | 3,82 | 2,58 | 3,85 | 3,23 |
| Віленская | 2,06 | 0,56 | 2,17 | 1,22 | 2,56 | 2,20 | 1,80 | 1,66 |
| Гродзенская | 0,20 | 0,65 | 0,28 | 0,47 | 0,59 | 0,57 | 0,49 | 0,60 |
| Мінская | 1,41 | 0,87 | 2,37 | 1,18 | 2,34 | 1,39 | 1,79 | 1,48 |
| Магілёўская | 0,88 | 1,83 | 1,30 | 1,33 | 0,80 | 1,07 | 0,53 | 0,72 |

З лічбаў прыведзеных у табліцы відавочна існаванне ў Віцебскай губерні дынамікі павелічэння колькасці малалетніх з 5,5 % да 7 % ад агульнай колькасці рабочых. Падобная характэрна для мясцовасці з значнай колькасцю прадпрыемстваў лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці. Варта ўлічваць і ніжэйшы за дарослых узровень аплаты працы малалетніх. Адным з магчымых тлумачэнняў падобнай з’явы можна лічыць наяўнасцю вялікай колькасці дзяцей у сем’ях і абмежаваным заробкам кіраўніка сям’і, што прымушала рабочых накіроўваць на працу сваіх дзяцей па дасягненні імі 12 год [5].

Пацвярджае выказаную вышэй гіпотэзу прыклад агляду земскім начальнікам Гарадокскага павету Віцебскай губерні Худзінскім шклозавода Мерліса «Труды». Так у пісьме ад 8 чэрвеня 1914 г. апошні Худзінскі паведамляе віцебскаму губернатару, што «3 чэрвеня ён у ходзе нечаканага візіту на фабрыку выявіў сярод працоўных некалькі дзясяткаў дзяцей ва ўзросце ад 10 і "нават 9 гадоў". З іх апытання высветлілася, што яны працуюць не толькі днём, але і ўначы, займаючыся нават такой цяжкай працай як выбіванне шкла. Большасць з іх хадзілі босымі, нягледзячы на тое, што падлога завода была «ўсеяна асколкамі шкла». У некаторых былі заўважаны на целе апёкі. Прыстаў , які ў гэты час знаходзіўся на заводзе, выказаў толькі здзіўленне з нагоды ўсяго выказанага. Падобны факт сведчыць аб парушэнні фабрычна-заводскага заканадаўства і шырокай эксплуатацыі дзяцей на выторчасці з боку прадпрымальніка [5].

Аднак, пры звароце фабрычнага інспектара да фабрыканта Мерліса, той патлумачыў гэту сітуацыю наступным чынам: «са шматлікіх наведванняў маіх заводаў і вывучэння роду працы, Вы верагодна уразумелі, што малалетнія і падлеткі працуюць выключна пры вырабе манапольнай посуду. На працу ў гэтым аддзяленні кантролі наймаюцца толькі старэйшыя рабочыя і іх памочнікі, ўскладаючы на іх жа клопат аб прыняцці сабе падручных ў асобе падлеткаў. Па гэтай прычыне заводакіраўніцтва часта фізічна не можа прадугледзець за законным выкарыстаннем працы малалетніх, так як рабочыя карыстаюцца (*як памочнікамі – Я.М.*) сваімі ж дзецьмі» [5].

Мерліс падкрэслівае, што шматразовыя патрабаванні канторы завода да святароў аб прад'яўленні метрычных выпісаў для дзяцей рабочых і аб'явы па заводзе, як роўна і асабістыя просьбы, звароты да працоўных пад пагрозай разлікаў і звальненняў, аб дастаўцы кантор сказаных выпісаў не прывялі да пажаданага выніку. Можна меркаваць, што святары па асабістых матывах, а самі працоўныя праз недасведчанасць і цяжкае матэрыяльнае становішча выкарыстоўвалі працу сваіх дзяцей. Сам Мерліс дадае, што «большасць рабочых, вельмі часта пераходзячы ад аднаго завода на іншы, нават не памятаюць у якім месцы дзеці нарадзіліся і які менавіта святар правёў святое хрышчэнне». Для пацвярджэння сваіх слоў Мэрліс дадае копіі запытаў аб даце хрышчэння накіраваных за яго кошт святарам [6].

Іншыя фабрыканты не мелі вялікай патрэбы ў працы малалетніх, таму без шкоды для сваёй вытворчасці адмаўляліся ад іх паслуг. Так, старэйшы фабрычны інспектар Гродзенскай губ. у сваёй справаздачы адзначаў, што колькасць малалетніх на прадпрыемствах не была істотна запатрабавана. Так, у 1907 г. нагляду інспекцыі Гродзенскай губ. было падначалены 414 прадпрыемстваў, з іх малалетнія працавалі на 11, з агульнай колькасці рабочых у 13900 чалавек малалетніх было 119 чал.

Невялікая ў параўнанні з Віцебскай губерняй вага малалетніх у другіх мясцовасцях тлумачыцца дзеяннем абмежавальных законаў, а таксама тым, што большасць прадпрымальнікаў адмовілася ад працы дзяцей не толькі забароненага ўзросту, але і тых, каму законам было дазволена працаваць. Некаторыя прадпрымальнікі не жадалі ўскладняць сваю дзейнасць рознымі фармальнасцямі (метрычныя выпіскі, фіксаванне малалетніх у спецыяльных кнігах, пастаянны кантроль інспекцыі) [3].

Шырэй выкарыстоўвалася праца падлеткаў дасягаючы ў Віцебскай і Мінскай губернях 15 % ад агульнай колькасці рабочых. Параўнальна менш працавала малалетніх на прадпрыемствах другіх губерняў

**Табліца 3. Удзельная вага падлеткаў сярод агульнай колькасці рабочых у працэнтах**

| Губерня | 1907 г. | | 1910 г. | | 1912 г. | | 1913 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Муж. | Жан. | Муж. | Жан. | Муж. | Жан. | Муж. | Жан. |
| Віцебская | 7,75 | 6,37 | 7,08 | 6,95 | 8,55 | 6,47 | 6,52 | 5,98 |
| Віленская | 6,56 | 5,74 | 6,65 | 5,22 | 5,63 | 5,72 | 5,74 | 6,19 |
| Гродзенская | 3,44 | 4,77 | 3,42 | 4,32 | 4,18 | 5,25 | 3,37 | 4,42 |
| Мінская | 6,10 | 6,96 | 7,41 | 7,04 | 8,44 | 7,78 | 7,13 | 10,92 |
| Магілёўская | 6,88 | 6,14 | 5,16 | 5,69 | 5,69 | 4,79 | 5,73 | 4,39 |

Агульная доля падлеткаў у беларускіх губернях мела некаторую тэндэнцыю да скарачэння з 11,5 % у 1907 г. да 9,7 % у 1913 г. Улічваючы

рост колькасці фабрычна-заводскіх рабочых, які назіраўся ў гэты час, можна канстатаваць наяўнасць дынамікі змяншэння маштабаў выкарыстання працы падлеткаў. Аднак, варта адзначыць існаванне дынамікі павелічэння долі падлеткаў сярод рабочых Мінскай губерні: з 13 % у 1907 г. да 18 % у 1913 г. пры павелічэнні агульнай колькасці прамысловага пралетарыяту губерні на 50 %. У перыяд з 1907 па 1914 гг. удзельная вага дарослых жанчын сярод агульнай колькасці пралетарыята ў беларускіх губернях адрознівалася. Найвялікшая вага жанчын сярод усіх рабочых назіралася ў Гродзенскай губерні, што можна патлумачыць наяўнасцю вялікай колькасці шэрсцеапрацоўчых, тытунёвых і іншых прадпрыемстваў, дзе шырока выкарыстоўвалася праца жанчын. У Віцебскай губерні назіралася змяншэнне ўдзельнай вагі дарослых жанчын пры росце іх колькасці. Тлумачыцца падобнае больш хуткім ростам агульнай колькасці пралетарыята губерні. У астатніх губернях вага жанчын заставлася прыкладна на адным узроўні. Варта адзначыць, што на пры разглядзе падобнай сітуацыі на ўзроўні ўсіх беларускіх губерняў у вывучаемым перыядзе вага засталася амаль нязменнай.

**Табліца 4. Удзельная вага дарослых жанчын на прадпремствах у працэнтах**

| Губерня | 1907 г. | 1910 г. | 1912 г. | 1913 г. |
|---|---|---|---|---|
| Віцебская | 26,35 | 25,62 | 24,17 | 22,67 |
| Віленская | 17,21 | 20,47 | 19,53 | 20,82 |
| Гродзенская | 33,41 | 32,16 | 31,13 | 32,16 |
| Мінская | 22,82 | 21,76 | 19,75 | 18,81 |
| Магілёўская | 18,16 | 21,59 | 20,18 | 22,13 |

Жанчыны, малалетнія і падлеткі былі запатрабаваныя ў асноўным на запалкавых, тытунёвых, шкляных, папяровая, фанерных, суконных, льнопрадзільная прадпрыемствах, г.зн. у лёгкай прамысловасці. Шырэй іх выкарыстоўвалі ў рамястве і гандлі. Удзельная вага малалетніх ў буйной прамысловасці на тэрыторыі Беларусі, па звестках З. Абезгауза, быў вышэй, чым ва ўсёй Расійскай імперыі, дзе ён складаў 11,1%. Відавочна, што падобнае можна растлумачыць перавагай у Беларусі галін лёгкай і харчовай прамысловасці.

Найбольш запатрабаваная катэгорыяй сярод рабочых былі дарослыя мужчыны. Менавіта яны з'яўляліся найбольш значнай катэгорыяй пралетарыята цэнзавай прамысловасці ў адзначаны час.

**Табліца 5. Удзельная вага дарослых мужчын на прадпремствах у працэнтах**

| Губерня | 1907 г. | 1910 г. | 1912 г. | 1913 г. |
|---|---|---|---|---|
| Віцебская | 53,97 | 55,92 | 54,41 | 57,75 |
| Віленская | 66,97 | 64,27 | 64,36 | 63,79 |
| Гродзенская | 57,53 | 59,35 | 58,29 | 58,95 |
| Мінская | 62,99 | 60,23 | 61,20 | 62,20 |
| Магілёўская | 66,11 | 64,86 | 67,47 | 66,49 |

З табліцы бачна, што паміж Віцебскай Гродзенскай губернямі з аднаго боку, Віленскай і Магілёўскай губернямі з другога боку існавала істотная адрозненне: у апошніх вага мужчын амаль на 10% была вышэйшай. Мінская

губерня займала цэнтральнае становішча, тут існавала даволі густая сетка чыгунак, што паскарала тэрытарыяльную мабільнасць працоўных, менавіта таму вага дарослых мужчын сярод пралетарыяту у гэтай мясцовасці была падобна на сярэдняе значэнне па ўсім беларускім губерням: 61,5 % у 1907 г., 60,9 % у 1910 г., 61,1 % у 1912 г., 61,8 % у 1913 г.

Падобная сітуацыя па размеркаванню пралетарыята па пола-узроставай прыкмеце была характэрна мясцін тагачаснай Расійскай імперы, якія з'яўляліся памежнымі ў адносінах да тэрыторыі Беларусі. Найбольш яскрава падабенства назіралася ў Смаленскай губерні.

Вышэй адзначаўся значны ўплыў на фарміраванне пралетарыяту за кошт сялянства. Так, сярод рабочых, занятых на прамысловых прадпрыемствах у сельскай мясцовасці яны пераважалі. У звестках падатнага інспектара Слонімскага павета, ў 1904 г. на шоўкакруцільнай і суконнай фабрыках, а таксама шклозаводзе гэтага павета працавала 700 былых сялян [1, с. 49]. Дырэктар распарадчык Добрушскай папяровай фабрыкі ў лютым 1905 г. канстатаваў, што кантынгент рабочых на гэтым прадпрыемстве складаўся пераважна з мясцовых сялян [4, с. 98]. Выхадцы з сялян у той або іншай колькасці працавалі на ўсіх буйных прадпрыемствах у гарадах (запалкавай фабрыцы «Бярэзіна» ў Барысаве, шпалернай фабрыцы, вакзальны машынабудаўнічым заводзе ў Мінску і інш.). У 1913 г. з 1253 рабочых льнопрадзільнай фабрыкі «Дзвіна» ў Віцебску 3/4 былі ў мінулым сялянамі бліжэйшых вёсак. [4, с. 150].

Падчас павелічэння агульнай колькасці рабочых беларускіх губерняў істотных зменаў у прапорцыях выкарыстання працы малалетніх, падлеткаў, жанчын і дарослых мужчын не адбылося. Выключэннем з'яўлялася Віцебскай губерня, дзе існавала тэндэнцыя да павелічэння долі малалетніх, ініцыятарам якой з'яўляліся ў тым ліку самі рабочыя, накіроўваючы сваіх дзяцей на прадпрыемствы для павелічэння бюджэту сям'і. Прычынай падобнага можна назваць нізкі узровень заробкаў на Віцебшчыне, які прымушаў бацькоў накіроўваць сваіх дзяцей на працу. Другой прычынай было імкненне фабрыкантаў зменшыць выдаткі на рабочую сілу: малалетнім трэба было плаціць меней. У Мінскай губерні адбываўся істотны рост колькасць падлеткаў на прадпрыемствах, які апераджаў дынаміку росту агульнай колькасці рабочых пры змяншэнні долі дарослых жанчын у падзеле працы. Тлумачыцца падобнае хуткім ростам эканомікі губерні, які прымушаў да суадноснага росту агульнай колькасці рабочых губерні амаль на 50 % з 1907 г. па 1913 г. Прычынай пераважнага найму падлеткаў з'яўляліся ніжэйшыя выдаткі на аплату іх працы ў параўнанні з дарослымі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Абезгауз, З.Е. Рабочий класс Белоруссии в начале XX в. (1900–1913 гг.). – Минск: Наука и техника, 1977. – 168 с.
2. Воронова, А.И. Численность, состав и положение фабрично-заводских рабочих накануне первой мировой империалистической войны // Большевистская печать и рабочий класс России в годы революционного подъема 1910-1914 / Акад. наук СССР. Ин-т истории. – М. : Наука, 1965. – С. 330-340.
3. История рабочего класса Белорусской ССР. В 4-х т. Т. I. Рабочий класс Белоруссии в период капитализма. – Мн.,1984. – 400 с.
4. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства, 1861–1914 гг. / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2013. – 333 с.
5. НГАБ. Ф. 2592. Воп.1. Спр. 251. Арк. 17

6. НГАБ. Ф. 2592. Воп.1. Спр. 251. Арк. 21-21 адв.
7. Организационные и методические принципы подготовки хроник рабочего и социал-демократического движения в России. 1895 – февраль 1917 г. Изд. 2-е. – М., 1990. – 176 с.
8. Свод отчетов фабричных инспекторов за 1907 г. – Спб.: тип. В.Ф. Киршбаума, 1909. – 156 с.
9. Свод отчётов фабричных инспекторов за 1909 г. – Спб.: тип. В.Ф. Киршбаума, 1910. – 195 с.
10. Свод отчётов фабричных инспекторов за 1910 г. – Спб.: тип. В.Ф. Киршбаума, 1911. – 319 с.
11. Свод отчётов фабричных инспекторов за 1912 г. – Спб.: тип. В.Ф. Киршбаума, 1913. – 318 с.
12. Свод отчётов фабричных инспекторов за 1913 г. – Петроград.: тип. В.Ф. Киршбаума, 1914. – 319 с.

**Маргулис Сергей Борисович**

*Российская академия народного хозяйства и государственной службы при Президенте Российской Федерации (Москва, Россия)*

## КИТАЙСКИЙ ПРОЕКТ «ЭКОНОМИЧЕСКИЙ ПОЯС ШЕЛКОВОГО ПУТИ» И ИНТЕРЕСЫ БЕЛАРУСИ

Начавшееся с реформами Дэн Сяопина активное экономическое развитие Китая превратило его из отстающей страны в одну из передовых экономик мира. Уже в самом начале XXI века Китай превзошел по уровню ВВП большинство развитых стран, а начиная с 2010 г., по этому показателю он уступает только США. По данным МВФ номинальный ВВП страны по итогам 2017 г. превысил $12 трлн [1]. Растущая экономическая мощь, доказательством которой служит успешное преодоление мирового финансового кризиса 2008–2009г., быстрое технологическое развитие, а также некоторые другие факторы привели к определенным изменениям во внешней политике КНР. Очевидно, что современный Китай постепенно отходит от заложенных Дэн Сяопином концептуальных основ, значительно ограничивающих его геополитическую и внешнеэкономическую активность, и превращается в один из главных центров силы современного многополярного мира. С целью дальнейшего увеличения роли Китая на международной арене и развития взаимовыгодного экономического сотрудничества, руководством «поднебесной» был представлен проект «Один пояс – один путь». Глобальная инициатива КНР вызвала повышенный интерес во многих странах мира, в том числе и в Беларуси.

**Китайский проект «Экономический пояс Шелкового пути».** «Экономический пояс Шелкового пути» (ЭПШП) представляет собой сухопутный торговый маршрут, созданный по образцу своего древнего прототипа, который свяжет Китай с Европой через территорию России и Центральную Азию. Он является составной частью мега-проекта «Один пояс – один путь», который по оценкам китайской стороны должен объединить 65 стран, генерирующих около 55 % мирового ВНП и составляющих примерно 70 % всего населения планеты. По мнеию китайских экспертов, на его реализацию отводится 30–35 лет [2].

Идею создания ЭПШП впервые выдвинул председатель КНР Си Цзиньпин во время своего выступления в Назарбаев Университете в столице